# «О, ЯКАЯ ЦУДОЎНАЯ ЧАЧА»...

## Нататкі пра фестываль новага віна ў Тбілісі і пра Грузію наогул

**«...Ваш занятак — самы высакародны ў свеце, — далятае фраза аднекуль злева... Як вы думаеце, пра што ідзе гаворка? Каб правільна адгадаць, трэба быць грузінам, таму што на ўвазе маецца вінаробства. А фразу я падслухала на фестывалі новага віна, які прайшоў у сярэдзіне мая ў Тбілісі.**

### «Мы можам прыводзіць да вас сваіх турыстаў. Колькі мы з гэтага будзем мець?»

Новае віно — гэта віно, якое было выраблена з апошняга ўраджаю, у гэтым выпадку — ураджаю 2015 года. Па традыцыі квеўры (керамічных збан, які закопваюць у зямлю і ў якім у Грузіі «саспявае» віно), адкаркоўваецца вясной. Таму і фестываль праводзіцца ў маі.

Увесь цэнтр тбіліскага парку Мтацмінда, дзе сёлета праходзіў фэст, быў аддадзены пад прылаўкі і палаткі вінаробаў. Сваю прадукцыю прывезлі вытворцы з усіх куткоў Грузіі — 78 вінных кампаній і 102 сямейныя, малыя, сярэднія і буйныя вінакурні. Іх прадстаўнікі з радасцю налівалі гасцям на пробу свайго віна. Да яго падаваліся сыр з авечага малака і духмяны хлеб. І ўсё гэта смачнае хараство было зусім бясплатным. Вакол тоўпіліся всёлыя, дабрадушныя людзі з келіхамі ў руках, у некаторых — у кожнай руцэ па келіху! Многія тбілісцы прыехалі цэлымі сем'ямі...

28-гадовы Рызо прыйшоў на дэгустацыю з сябрамі. Малады чалавек, нягледзячы на спякоту, апрануты ў традыцыйны грузінскі касцюм. «Гэта каб стварыць святочны настрой, бо такі фестываль не кожны дзень бывае», — тлумачыць ён. І дадае, што ў многіх яго сяброў ёсць дома нацыянальныя касцюмы, хоць яны і нятанныя: кошт пачынаецца ад 400 долараў. Проста грузіны ганарацца сваёй зямлёй і гісторыяй...

32-гадовая Ніно ўжо 10 гадоў жыве ў Францыі, але і пра родную краіну не забывае, часта сюды наведваецца. У Францыі жанчына займаецца продажам грузінскіх вінаў. Таму на фестываль яна прыехала і ў сувязі са сваім бізнесам: пазнаёміцца з новымі віннымі гаспадаркамі і іх прадукцыяй. «Грузія не стаіць на месцы, — з гонарам кажа маладая жанчына. — Яна мяняецца, прычым у лепшы бок. У 90-я гады на тбіліскіх вуліцах па вечарах нярэдка кулі над галавой свісталі. Калі я з'язджала, усе мае сябры былі беспрацоўнымі, а цяпер ва ўсіх ёсць праца. У Саакашвілі, па-мойму, было шмат добрага і шмат дрэннага, хоць людзям звычайна больш запамінаецца дрэннае. Ён падняў краіну, адбудаваў яе. Але ў той жа час шмат людзей пасадзіў у турму. Усе жылі ў страху...».



28-гадовы Рызо прыйшоў на дэгустацыю ў традыцыйным грузінскім касцюме.

Не толькі Ніно займаецца тут наладжваннем новых дзелавых кантактаў. Вось два мясцовыя гіды дамаўляюцца з уладальнікам віннага бара: «Мы можам прыводзіць да вас сваіх турыстаў. Колькі мы з гэтага будзем мець?». «Дзесяць працэнтаў, як належыць», — адказвае той.

— Мы знаходзімся ў нетурыстычным месцы, — кажа ўладальнік бара Аляксандр. — Да нас ходзяць звычайна мясцовыя жыхары. Але ж гэта і ёсць паказчык якасці. У турыстычных месцах, самі ведаеце, за якасцю не вельмі глядзяць. Але мы хацелі б мець сярод сваіх гасцей і турыстаў...

Праз дзесяць хвілін чую, як ён, пакаштаваўшы і ацаніўшы ўзор вінаграднай гарэлкі, кажа ўладальніку віннай гаспадаркі з Кахэці: «О, якая цудоўная чача! Мы хацелі б яе атрымліваць...»

### Келіх віна каштуе танней, чым шклянка мінеральнай вады

Самі грузіны аддаюць перавагу беламу віну. Яны кажуць, што для весялосці трэба піць белае, а чорнае (так яны называюць чырвонае віно) — каб лячыцца. Верагодна, таму, што белае віно значна лягчэйшае, чым чырвонае, і, адпаведна, лепш падыходзіць для шумных і доўгіх бясед. Бо грузінскае застолле можа доўжыцца да 5-6 гадзін, і за гэты час кожны грузін выпівае па 2,5-3 літры віна! Пры гэтым яны не гоняцца за градусамі, іх хатнія віны, асабліва белыя, як па мне, больш падобныя на кампот. Галоўнае — гэта зносіны. І п'янага грузіна ўбачыць — вялікая рэдкасць. Я за тыдзень знаходжання ў Тбілісі, у тым ліку пабываўшы на фестывалі маладога віна, убачыла ўсяго двух чалавек падшафэ!

Пры гэтым вінаробства для грузінаў — неад'емная частка жыцця. Большасць гарадскога насельніцтва, нават людзі, якія жывуць у шматпавярховых дамах, кожны год купляюць вінаград і ў гаражах робяць сваё віно. Што тады казаць пра вёску! Так што атрымліваецца, што ў Грузіі робіць віно практычна кожная сям'я, якая мае для гэтага хоць самую маленькую магчымасць.

У мясцовых кавярнях келіх віна з бліжэйшай вінакурні парой каштуе танней, чым шклянка мінеральнай вады! Гаспадар прыватнай гасцініцы або апартаментаў можа пры першай сустрэчы падарыць пастаяльцу бутэльку віна. А год таму маёй сяброўцы ў аэрапорце, не паспела яна яшчэ толкам нават ступіць на грузінскую зямлю, таксама паднеслі вялікую бутэльку віна. Напэўна, акцыя нейкая была.

### У Грузіі для турыстаў усё працуе да 24 гадзін

Фестываль новага віна, які ўжо сёмы год запар арганізуе Вінны клуб Грузіі, апроч іншага, ставіць сваёй мэтай развіццё віннага турызму, на які грузіны робяць асаблівую стаўку. Трэба сказаць, у Грузіі наогул турызм цяпер развіваецца вельмі актыўна. Дзяржава з гэтай нагоды распрацавала вялікую праграму і ўкладвае ў яе грошы.

Часам нават ствараецца ўражанне, што ў Тбілісі ўсё круціцца вакол турыстаў. Тут вельмі лёгка і проста знайсці жыллё на любы густ і кашалёк, і нават здаецца, што можна нічога загадзя не браніраваць. Выходзіш з самалёта ці цягніка — і на кожным кроку бачыш рэкламу гестхаўзаў, гатэляў, апартаментаў. Ці можна спытаць парады ў мясцовых жыхароў — яны ўважлівыя, добразычлівыя, усмешлівыя і пры гэтым неназойлівыя — самі навязвацца не будуць, але пры неабходнасці заўсёды падкажуць і раскажуць, а то і дапамогуць — і ўсё гэта будзе ад душы.

Тут не праблема паесці або проста перакусіць — і зноў жа, на любы кашалёк. У гістарычнай частцы Тбілісі на кожным кроку — шчыты з рэкламай экскурсій як па сталіцы, так і па ўсёй краіне. На вуліцах ля турыстычных аб'ектаў у велізарнай колькасці прадаецца ўсялякая ўсячына — сувеніры, паветраныя шарыкі, вада, чурчхела (старажытны нацыянальны ласунак — нанізаныя на нітку арэхі ў загушчаным мукой вінаградным соку). І, у адрозненне ад многіх іншых краін, у Грузіі для турыстаў усё працуе дапазна — да 24 гадзін.

Яшчэ адзін немалаважны момант — сёння шпацыраваць па Тбілісі бяспечна ў любы час сутак. Тут амаль цалкам расправіліся з вулічнай злачыннасцю, зрэшты, як, па словах мясцовых жыхароў, і з хабарніцтвам. Мясцовыя кажуць, што гэта дзякуючы таму, што пры Саакашвілі была праведзена маштабная паліцэйская рэформа. Расказваюць, што тады звольнілі ўсіх і зноўку набралі ў штат тых, хто ніякага дачынення да паліцыі не меў. Цяпер у Грузіі працаваць у паліцыі вельмі прэстыжна. І ў народзе паліцэйскіх паважаюць. А паліцэйскія ўчасткі зроблены са шкла — каб падкрэсліць іх празрыстасць.

Звярніце ўвагу, колькі беларускіх турфірмаў у апошні час прапануе туры ў Грузію. Многа! А яшчэ пару гадоў таму знайсці гатовы тур у гэтую краіну ў нашых агенцтвах было не так і проста. А цяпер з'явіліся білборды, радыёрэклама і шырокая прапанова пуцёвак. Усё таму, што Грузія стала рабіць стаўку і на беларускіх турыстаў.

**Дарэчы**

### Некалькі фактаў пра грузінаў

✓ Выходзячы замуж, дзяўчаты, як правіла, пакідаюць сваё прозвішча.

✓ Калі кіроўца забыўся дома правы, іх могуць замяніць пашпарт або любы іншы дакумент, які сведчыць асобу. Тэхагляд таксама не абавязковы.

✓ Лічаць, што калі на стале няма хлеба, то няма чаго есці. Бяседа па-грузінску завецца «пурмарылі», што ў перакладзе азначае «хлеб-соль». Першымі падаюць на стол менавіта хлеб і соль.

✓ Пазнаюць земляка па прозвішчы. Так, напрыклад, у Заходняй і Цэнтральнай Грузіі прозвішчы пераважна заканчваюцца на «-дзэ», што значыць «сын». Ва Усходняй — на «-швілі», што азначае «дзіця». Прозвішчы з усходніх горных правінцый заканчваюцца на «-уры» або «-улі».

### Славутая грузінская гасціннасць цяпер прыносіць краіне да 7% ВУП

Увогуле, знакамітая грузінская гасціннасць сёння прыносіць краіне да 7% ВУП. Колькасць занятых у гэтай сферы, па звестках Нацыянальнай адміністрацыі турызму Грузіі, складае 11% ад агульнай колькасці працоўных месцаў. Турыстычны бізнес ператвараецца ў адну з самых сур'ёзных крыніц паступлення валюты ў краіну.

Дапоўніць традыцыйную гасціннасць грузінаў добрым сэрвісам дапамагаюць спецыяльныя адукацыйныя праекты. Таксісты, гіды, супрацоўнікі рэстаранаў і гатэляў праходзяць спецыяльныя курсы. Нацыянальная адміністрацыя турызму, напрыклад, аплачвае іх навучанне мовам. А нядаўна ў Грузіі пачалася рэалізацыя новага праекта — інклюзіўнага турызму для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У яго рамках ідуць работы па ўладкаванні турыстычнай інфраструктуры ў адпаведнасці з патрэбамі асоб з абмежаванымі магчымасцямі, створаны спецыяльныя, адаптаваныя для гэтых людзей маршруты, праводзяцца трэнінгі работнікаў сферы абслугоўвання.



***P.S.*** *Адна з нямногіх мясцовых асаблівасцяў, што крыху напружвала асабіста мяне — паводзіны мясцовых кіроўцаў. Пешаходных пераходаў тут вельмі мала, і яны для грузінскіх кіроўцаў — чыстая фармальнасць, іх проста ігнаруюць. Таму тбіліскія вуліцы я перасякала выключна бегма. Адзін з мясцовых жыхароў неяк патлумачыў, што калі пешаход перабягае ажыўленую вуліцу — гэта дакладна іншаземец. Пешаход-грузін ідзе ў любым месцы праз дарогу з годнасцю, не спяшаючыся. Асабіста ў мяне спачатку нервы не вытрымлівалі, але пад канец я нават крыху прывыкла. І, памятаю, калі наш джып з заказанай экскурсіяй на двухпалоснай дарозе аднячасова сталі абганяць злева і справа, а кіроўца толькі лагодна цокнуў языком: «Грузіны едуць, як джыгіты!», я ўжо толькі ўсміхнулася... Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што дарожна-транспартнага здарэння я не бачыла ніводнага і дзіўлююся іх адсутнасці да гэтага часу.*

**Святлана БУСЬКО**, *busko@zviazda.by.*